**Семінар-практыкум “Значэнне школьнай адзнакі ў жыцці дзіцяці”**

І ступень – “Маё дзіця – малодшы школьнік” для бацькоў навучэнцаў ІІІ класа

Дата правядзення: 24.09.2022г.

*Класны кіраўнік ІІІ класа*
*Мулярчык Тацяна Канстанцінаўна*

**Мэта:** стварэнне ўмоў для ўспрымання разнастайнасці меркаванняў па значэнні адзнак у жыцці дзіцяці і для актывізацыі інтэлектуальных і камунікатыўных здольнасцей бацькоў, зацікаўленых у атрыманні дадатковых ведаў у праяўленні гуманных (асобасна-арыентаваных) адносін да школьных адзнак.

**Задачы:** паказаць бацькам значэнне школьнай адзнакі ў жыцці дзіцяці; фарміраваць культуру бацькоўскага ўспрымання вучэбных уменняў свайго дзіцяці.

**Ход бацькоўскага ўніверсітэту:**

**І. Уступнае слова класнага кіраўніка.**

– Сённяшнюю нашу размову я хачу пачаць з добра ўсім вядомай прытчы. “Жыў мудрэц, які ведаў усё. Адзін чалавек захацеў даказаць, што мудрэц ведае не ўсё. Заціснуўшы ў далонях матылька, ён спытаў: “Скажы, мудрэц, які матылёк у мяне ў руках: мёртвы ці жывы?” А сам думае: “Скажа жывы – я яго заб’ю, скажа мёртвы – выпушчу”. Мудрэц, падумаўшы, адказаў: “Усё ў тваіх руках”. Гэтая прытча сугучная з дадзенай тэмай. Бо ў нашых руках магчымасць стварыць такую атмасферу дома і ў школе, дзе дзеці будуць адчуваць сябе ўпэўнена і спакойна. Для гэтага найперш настаўнік і бацькі павінны дзейнічаць разам, прытрымлівацца адзіных патрабаванняў і быць адзіным цэлым.

–Тэма нашага сходу “Значэнне школьнай адзнакі ў жыцці дзіцяці”. Таму сёння мы пагаворым аб школьнай адзнацы, якая адыгрывае значную ролю ў жыцці вашага дзіцяці і вашай сям'і; менавіта школьная адзнака з’яўляецца яблыкам разладу паміж членамі і сям’і і меркай каштоўнасцяў у выхаванні дзіцяці. У аснове пазітыўнай самаацэнкі школьніка ляжаць яго ўласныя поспехі ў вучэнні, а таксама станоўчыя адносіны да яго з боку блізкіх дарослых. Малодшы школьны ўзрост з’яўляецца вузлавым у станаўленні самаацэнкі.

У многіх асацыяцыі да слова “Школа” – адзнака ці нават канкрэтна: дзясятка, двойка. Так, але нажаль, не могуць усе быць выдатнікамі. Бо

галоўнае ў жыцці не веданне, а ўменне яго прымяніць. Дык што ж такое ацэнка і адзнака?

Ацэнка – слоўны выраз. “Думка аб каштоўнасці, узроўні або значэнні кагонебудзь, чаго-небудзь”. Адзнака – лічбавы выраз.

Дзіця павінна зразумець, што вучыцца для сябе, а не для бацькоў. Неабходна сфарміраваць у дзіцяці пэўную матывацыю да навучання. Некаторыя бацькі “выбіваюць” адзнакі са сваіх дзяцей, прымушаючы іх працаваць па пяць гадзін. У выніку ў дзіцяці не застанецца часу для прагулкі, а яна неабходна. Падобная “дбайнасць” пад вашым націскам, дарагія бацькі, гэта вы ведаеце самі, не толькі launch ператамленне дзіцяці, але і хуткая страта цікавасці да вучэння. Не, не заўсёды нам трэба імкнуцца да таго, каб у дзіцяці ў сшытку былі адны “10”. Свае патрабаванні вы павінны сувымяраць з яго магчымасцямі. І дрэнна з-за свайго славалюбства настойваць на тым, каб дзеці прыносілі толькі “10”. Гэта можа не толькі паўплываць на здароўе, але і прывесці да таго, што ў дзіцяці з’явіцца нездаровае славалюбства і іншыя дрэнныя рысы. Напрыклад, калі пасля “10” раптам атрыманая “8” выклікае слёзы! Або калі дзіця надзімае вусны, калі сшытак яго не ляжыць першым! За гэтымі ўчынкамі хаваюцца рысы эгаізму. Праўда, пакуль яшчэ ледзь заўважныя. Некалькі слоў хачу сказаць аб дзецях, у якіх стамляецца рука пры пісьме, ім трэба больш маляваць, выразаць, майстраваць. А замест гэтага дома прымушаюць перапісваць адну і тую ж работу па 5-6 разоў. Часам некаторыя з бацькоў, каб палепшыць адзнаку дзіцяці, самі падпраўляюць няўдалыя літары, а часам, гэта ўжо зусім выходзіць за рамкі, пішуць усю работу. Адкінье, калі ласка, ілжывае самалюбства, не палохайцеся ”3” і, самае галоўнае, не вучыце дзіця хлусіць!

Памятайце, што караючы дзіця, вы не паўплываеце яго паспяховасць, але можаце яго маральна скалечыць, азлабіць, зрабіць ілжывым, баязлівым, а часам упартым і грубым. У школе дзіця ўпершыню сутыкаецца са знешняй ацэнкай сваіх дзеянняў. Першыя адзнакі звязаныя для яго як з дадатнымі, так і з адмоўнымі перажываннямі. Калі мы жадаем, каб галоўным для дзіцяці заставаліся веды, а не адзнакі, неабходна вызначыцца, першым чынам нам самім. Стаўленне дзіцяці да ацэнак шмат у чым залежыць ад нашага стаўлення да іх. Калі мы, кажучы аб школе, перш за ўсё распытваем аб ацэнках і бурна рэагуем на дрэнныя, для дзіцяці ацэнка стане асноўнай часткай школьнага жыцця.

**II. Мадэляванне педагагічных сітуацыі**

*(Настаўнік прапануе сітуацыі, якія бацькі абмяркоўваюць у групах і прапануюць варыянты іх рашэння.)*

1) Дзіця не хоча вучыць урокі самастойна і чакае бацькоў да таго часу, пакуль яны не вернуцца з працы.
2) Дзіця выконвае хатняе заданне, але настаўнік ацэньвае выкананае заданне дрэннай адзнакай.
3) Падчас выканання дамашняга задання дзіця няўважлівае, робіць памылкі, неахвотна даводзіць пачатае да канца.
4) Дзіця піша дрэнна, неакуратна, а перапісваць заданне не жадае.
5) Дзіця прыходзіць дадому з чарговай дрэннай адзнакай.
6) Дзіця атрымлівае дрэнную адзнаку, але кажа бацькам, што атрымала выдатную адзнаку. Гэта паўтараецца дастаткова часта.
7) Дзіця абвінавачвае настаўніка ў тым, што яно несправядлівае ў ацэнцы яго ведаў.

**III. Педагагічны трэнінг**

**Практыкаванне 1.** Паважаныя бацькі! Адкажыце, калі ласка, на пытанне: "Што значыць для вас школьная адзнака вашага дзіцяці?"

*(На дошцы запісваюцца меркаванні бацькоў, якія часцей за ўсё паўтараюцца, затым гэтыя меркаванні абмяркоўваюцца.)*

**Практыкаванне 2.** Бацькі абмяркоўваюць свае дзіцячыя ўспаміны, звязаныя са школьнымі адзнакамі. Яны асэнсоўваюць іх са сваёй цяперашняй бацькоўскай пазыцыі.

**Практыкаванне 3.** Цяпер я прапаную ўспомніць карціну знакамітага мастака Фёдара Паўлавіча Рашэтнікава “Зноў двойка” і спрагназаваць фінал гэтай карціны, але з пазіцыі XXI стагоддзя.



Карціна “Зноў двойка” расказвае пра побыт звычайнай сям’і. Абстаноўка таксама тыповая для многіх сем’яў 50-х гадоў XX стагоддзя.

Галоўны герой карціны “Зноў двойка” – хлопчык-падлетак гадоў дзесяці. Яго знешні выгляд яскрава дэманструе, што пасля ўрокаў школьнік не спяшаўся дадому, а яшчэ доўгі час праводзіў на вуліцы, катаючыся на каньках. На хлопчыку зімовае паліто, але верагодна адарваўся гузік і яно

расшпілена. У руцэ перавязаны патрапаны партфель, які, магчыма, не аднойчы служыў яму замест мяча ці санак. З партфеля віднеюцца канькі. Растрапаныя валасы, счырванелыя вушы, зачырванелыя ад марозу шчокі – сведчанне таго, што хлопчык не адну гадзіну правёў на вуліцы.

Ён робіць засмучаны выгляд, апусціўшы галаву і апусціўшы вочы, адлюстроўвае перажыванне наконт чарговай атрыманай двойкі. Але такая сітуацыя для яго ўзнікае не першы раз і хлопчык ужо ведае, што трэба рабіць і як сябе паводзіць. Ён ужо неаднаразова даваў маці абяцанне заўсёды выконваць дамашнія заданні, але акрамя ўрокаў у яго свеце столькі цікавага… А ў гэтым узросце так лёгка можна забыцца пра ўрокі.

Магчыма, менавіта таму ён і прыйшоў са школы позна, бо баяўся заслужанага “наганяю” ад маці за двойку. А замест гэтага з задавальненнем пагуляў з дзецьмі ў двары ў снежкі. Але зімой дні кароткія, стала цямнець, і трэба было ісці дадому.

Хлопчыка радасна сустракае белай афарбоўкі з рудаватымі плямамі сабака. Відаць, сабачка вельмі прывязаны да свайго маладога гаспадара і сваёй звычайнай манерай паказвае, як рады яго прыходу дадому ў надзеі разам пагуляць. Пярэднімі лапкамі ён упёрся на грудзі, і весела скуголячы, віляючы хвастом, і спрабуе лізнуць свайго сябра.

Каля абедзеннага стала, пакрытага светлым паласатым абрусам, стомлена, склаўшы рукі на сваіх каленях, сядзіць маці. Можна здагадацца, што яна толькі на хвілінку пакінула свае бясконцыя хатнія справы. Убачыўшы сына з прыкметна сумнай знешнасцю, яна ўсведамляе, што сынок “двоячнік” ўдосталь нагуляўся, і не думае аб уроках, і не хвалюецца аб дрэннай адзнацы, якуюдядаўна атрымаў. Але ў прысутнасці маці і старэйшай сястры робіць прыгнечаны выгляд. У жанчыны, здаецца, ужо няма сіл, каб паўплываць на сына ў надзеі прымусіць яго быць уважлівым і вядома добра вучыцца ў школе. Мама з сумам пазірае на падлетка.

У пакоі пад грознай увагай мамы на некаторы час усе заціхлі, чуюцца толькі ціхія ўздыхі мамы, сапенне хлопчыка і ціканне старэнькіх ходзікаў.

Старэйшая сястрычка выцягвае са свайго школьнага партфеля падручнікі і старанна складаючы іх на стол, рыхтуецца да выканання хатніх заданняў. Яна з дакорам пазірае на брацікa, у яе вачах таксама як і ў мамы адсутнічае якое-небудзь спачуванне. Магчыма, сястра вучыцца добра і лічыць, што брацік проста “разгільдзяй”, і двойку заслужыў: урокі амаль не вучыць, на занятках круціцца, ды яшчэ і ўвесь час засмучае маму.

Непадалёк з жанчынай на дзіцячым веласіпедзе яе малодшы сын-дашкольнік, які нават крыху задаволены, што не толькі яго аднаго ўшчуваюць за пястоту і дзіцячыя свавольствы.

**IV. Інтэрактыўнае заданне “Парады бацькам школьніка”**

*(Настаўнік загадзя рыхтуе “скрыначку парад”, у якой знаходзяцца карткі з правіламі ацэначнай бяспекі (па колькасці ўдзельнікаў сходу; карткі могуць быць перавернуты або складзены, каб забяспечыць выпадковасць выбару).)*
*(Бацькі выпадковым чынам дастаюць карткі і каменціруюць гэтыя правілы, у дачыненні да сваёй сям’і і да ўласнага дзіцяці.)*

*(Магчымыя парады (настаўнік можа дапоўніць пералік сваімі рэкамендацыямі з вопыту работы.)*

1. Не ўшчувайце сваё дзіця за дрэнную адзнаку. Яму жадаецца быць у вашых вачах добрым. Калі быць добрым не атрымліваецца, дзіця пачынае хлусіць выкручвацца, каб усё такі быць у вашых вачах добрым.
2. Спачувайце свайму дзіцяці, калі ён доўга працаваў, але вынік яго працы невысокі. Растлумачце, што важны не толькі высокі вынік. Больш важныя веды, якія ён зможа набыць у выніку штодзённай, упартай і клапатлівай працы.
3. Не прымушайце сваё дзіця вымольваць сабе адзнаку ў канцы чвэрці дзеля вашага душэўнага спакою.
4. Не вучыце сваё дзіця лоўчыць, прыніжацца і прыстасоўвацца дзеля дадатнага выніку ў выглядзе высокай адзнакі.
5. Ніколі не выказвайце сумненняў з нагоды аб’ектыўнасці выстаўленай вашаму дзіцяці адзнакі ўслых.
6. Ёсць сумненні – ідзіце ў школу і паспрабуйце аб’ектыўна разабрацца ў сітуацыі. Не абвінавачвайце беспадстаўна іншых дарослых, настаўнікаў і дзяцей у праблемах уласных дзяцей.
7. Падтрымлівайце дзіця ў яго, хай не вельмі значных, але перамогах над сабой, над сваёй лянотай.
8. Уладкоўвайце святы з нагоды атрымання выдатнай адзнакі. Добрае, як і дрэннае, запамінаецца дзіцём надоўга і яго хочацца паўтарыць. Няхай дзіця атрымлівае добрую адзнаку дзеля таго, каб яго адзначылі. Неўзабаве гэта стане звычкай.
9. Дэманструйце станоўчыя вынікі сваёй працы, каб дзіцяці хацелася іх пераймаць.

**V. Вынік бацькоўскага ўніверсітэту. Рэфлексія**

Паважаныя бацькі! Якую ж выснову можна зрабіць, падводзячы вынікі гэтага сходу. І “двоечнікам”, і “харашыстам” неабходна паменшыць хваравітасць няўдач, эмацыйна пераадольваць траўматычныя сітуацыі, злучаныя са школьнымі адзнакамі. Пахвала ім неабходна, але неабходны і ўказанні на памылкі, недахопы, недакладнасці.

*(Удзельнікі сходу па жаданні выказваюць свае ўражанні.)*

Напрыклад:
“Самым галоўным для мяне сёння было…”
“Цяпер я зразумеў(ла), што…”
“Я па-ранейшаму лічу, што…”
”Адкрыццём для мяне стала…”
“Я згодзен(а) (не згодзен(а)) з тым, што…”.

А на развітанне, я хачу звярнуцца да цытаты вядомага савецкага і расійскага псіхолага У.Л.Леві: “Не дазволь адзнацы зжэрці душу твайго дзіцяці (нават калі гэтае дзіця ўжо вышэй цябе ростам) – заўсёды будзь на баку дзяцінства, на сонечнай!”